# АКСІЯСФЕРА ЎЗАЕМААДНОСІН ТВОРЧАЙ АСОБЫ З ГРАМАДСТВАМ І АСЯРОДДЗЕМ У БЕЛАРУСКІМ РАМАНЕ 1960–1970-Х ГАДОЎ

*Г.В. Навасельцава*
*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*

Раман мэтазгодна разумець як адкрытую змястоўную форму сінкрэтычнага ўвасаблення рэчаіснасці, што адлюстроўвае пісьменніцкую канцэпцыю канфліктных узаемаадносін асобы і акаляючага яе асяроддзя, асэнсоўвае дамінантныя аксіялагічныя вектары духоўнага жыцця грамадства і ў выніку пацвярджае існуючую эстэтычную традыцыю або палемізуе з ёй. Вядомыя беларускія раманісты, у тым ліку У. Караткевіч, І. Шамякін, імкнуліся вызначыць аксіялагічныя параметры грамадства, дзеля чаго звярталіся таксама і да паказу асобы творчай прафесіі. Узору лірычнага рамана адпавядае «Нельга забыць» («Леаніды не вернуцца да Зямлі») (1960–1962) У. Караткевіча, дзе ў цэнтры раманнай сітуацыі знаходзіцца галоўны герой, апантаны літаратурай і мастацтвам, асэнсоўваюцца яго ўнутраны свет, асвятляецца працэс духоўнага сталення асобы. Безумоўна, «пісьменнік засяродзіў увагу пераважна на духоўных пошуках творчай інтэлігенцыі, на каханні Андрэя Грынкевіча і Ірыны Горавай» [1; с. 129], ён «заклікае паважаць, цаніць і любіць тых людзей, якія робяць жыццё прыгожым і змястоўным, адчуваюць веліч і радасць жыцця, змагаюцца за яго» [1; с. 125]. Адной з прычын чытацкай цікавасці да рамана «Атланты і карыятыды» (1971–1973) І. Шамякіна стала тое, што гэты твор «рэзка вылучаўся сярод беларускай прозы 1970-х гадоў з выразнай дамінацыяй у ёй ваеннай і вясковай тэматыкі» [2; с. 254]. Думаецца, што і павышанай аўтарскай увагай да чалавечых узаемаадносін, як прафесійна-творчых, так і прыватна-сямейных, а менавіта прыватная сфера ў айчыннай раманістыцы была пазбаўлена належнай увагі. Раманы гэтых аўтараў рэпрэзентуюць духоўныя пошукі творчай асобы, яе няпростыя ўзаемаадносіны з грамадствам і акаляючым асяроддзем. Аксіясфера твораў класічнай літаратуры застаецца актуальным напрамкам даследавання ў айчынным літаратуразнаўстве. Мэта даследавання – акрэсліць аксіясферу ўзаемаадносін творчай асобы з грамадствам і асяроддзем ў беларускім рамане 1960–1970-х гадоў на прыкладзе твораў У Караткевіча, І. Шамякіна.

**Матэрыял і метады.** Матрыялам выступаюць раманы «Нельга забыць» («Леаніды не вернуцца да Зямлі») У. Караткевіча, «Атланты і карыятыды» І. Шамякіна. У працы выкарыстаны комплексны падыход (культурна-гістарычны метад з элементамі фенаменалагічнага аналізу).

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Асэнсаванне айчыннай гісторыі Уладзімірам Караткевічам вызначаецца выкарыстаннем класічнай шматгеройнай раманнай формы з панарамным паказам рэчаіснасці («Каласы пад сярпом тваім», 1962–1964), дзе ў цэнтры раманнай сітуацыі знаходзяцца створаныя аўтарскім вымыслам героі, іх патрыятычныя і маральна-этычныя якасці акцэнтуюць персанажы з мікраасяроддзя, сярод якіх шмат рэальных гістарычных асоб. Заканамерна, што галоўны герой лірычнага рамана выяўляе шэраг аўтабіяграфічных рыс, пісьменнік звяртаецца да мастацкага адлюстравання рэальнай жыццёвай сітуацыі, выкарыстоўвае прататыпы. Галоўны герой шмат у чым раскрывае духоўныя пошукі аўтара, блізкі многім караткевічаўскім героям, якія вызначаюцца высакароднасцю, абвостраным пачуццём справядлівасці, высокай патрабавальнасцю да сябе і іншых, рашучым непрыманнем усяго, што супярэчыць маральна-этычным нормам. Так, знакаміты пачынальнік беларускай гістарычнай прозы «любіў ствараць характары буйныя, мэтанакіраваныя, свядома бунтарскія, гранічна сумленныя, але заўсёды душэўна адкрытыя і прамыя і таму рамантычна некалькі адназначныя» [3; с. 69]. Аднак менавіта рамантычная ўзнёсласць караткевічаўскіх герояў і выклікае найбольшую цікавасць, сімпатыю чытачоў розных пакаленняў. Асоба галоўнага

героя ў рамане «Нельга забыць» маркіруе атмасферу грамадскай сітуацыі, у прыватнасці, акцэнтуецца ўвага на творчасці, пошуках, якая склалася ў літаратурным асяроддзі. Заканамерна, што аўтар выкарыстоўваў найперш уласны пісьменніцкі досвед, перадаваў свайму персанажу шмат чаго з пражытага ім самім.

У айчынным літаратуразнаўстве выказвалася слушнае меркаванне, што характар Андрэя раскрываецца ў творчым гарэнні. Разам з тым П. К. Дзюбайла папракаў аўтара за тое, што герой «паволі пачынае жыць выключна сваім уласным настроем, адыходзіць ад таго асяроддзя, што спачатку і вызначала агульны характар яго душэўнага стану» [4; с. 35]. Думаецца, вядомы даследчык кіраваўся найперш агульнапрынятымі ў час выхаду твора патрабаваннямі да рамана з эпічнай канцэпцыяй раскрыцця рэчаіснасці. Уладзімір Караткевіч, як і Янка Брыль, стварыў лірычны раман, які вызначаўся адметнай эстэтыкай, а таксама раманнай сітуацыяй якасна іншага маштабу, чым традыцыйна прыняты ў айчыннай буйной прозе. У сферу духоўнага вопыту Андрэя Грынкевіча ўваходзяць невыпадковыя персанажы, якія раскрываюць яго чалавечыя якасці, творчыя памкненні: так, адцяняюць лепшыя духоўныя праявы (каханне, сяброўства) героя Ірына Горава, Яніс Вайвадс, Ганна і, наадварот, кантрастуюць з гэтымі персанажамі Марыя Крат, Стаўроў. Уладзімір Караткевіч мэтаскіравана звяртаецца да ўвасаблення так званай «плыні свядомасці», якая рухаецца не столькі ў рэчышчы аб'ектыўнага, колькі суб'ектыўнага дзеяння. Менавіта ў лірычным рамане гэты прыём становіцца сэнсаўтваральным, выяўляе ў цэлым значныя эстэтычныя мажлівасці. Павышаецца мастацкая значнасць асацыятыўных сувязяў: «А Ірына ўвесь час была спакойнай і халоднай, ані разу не затрымала на ім вачэй. Так, суха прабягала позіркам. І ад срэбнага дня і ад яе халоднасці ў душы нараджаўся нейкі лікуючы адчай» [5; с. 193]. У выніку на першы план выступае так званае ўнутранае дзеянне, якое найбольш яскрава дазваляе прасачыць прычынна-выніковыя сувязі ўчынкаў, а праз гэта і духоўны стан героя. У раманах «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» (1965–1966), «Чорны замак Альшанскі» (1979) суб'ектная арганізацыя аповеду ілюструе значныя мастацкія мажлівасці спалучэння раманнай формы і стылізацыі пад старажытнае пісьмо, жанравага сінтэзу з дэтэктыўнай прозай. Паказ «перакрыжавання» розных тэмпаральных адрэзкаў мінулага, мінулага і аўтарскай сучаснасці абумоўлівае ўвасабленне гісторыі ў шырокім сацыяльна-культурным кантэксце праз увядзенне скразных вобразаў, якія выступаюць выразнікамі аўтарскай канцэпцыі нацыянальнай гісторыі. У рамане «Нельга забыць» на канцэптуальным узроўні асэнсоўваецца роля творчай асобы для духоўнага развіцця грамадства.

Іван Шамякін, які ў сваіх творах разглядаў розныя праблемы сваёй сучаснасці, раскрывае наватарскі аспект тэмы пра мастакоў і мастацтва ў шырокім грамадска-сацыяльным кантэксце. Як вядома, «сам І. Шамякін на адной з сустрэч з чытачамі падкрэсліў, што гэты загаловак трэба разумець як "мужчыны і жанчыны"» [6; с. 445]. У рамане разглядаюцца ўнутрысямейныя стасункі, якія паказваюць як культуру чалавечых адносін, так і маральна-этычныя заганы аўтарскіх сучаснікаў. Тым не менш у раманнай сітуацыі відавочна вылучаецца вобраз Максіма Карнача: аўтар у значнай меры рэпрэзентуе акаляючую рэчаіснасць праз успрыманне гэтым героем, робіць яго выразнікам сваёй думкі, носьбітам найлепшых маральна-этычных якасцяў. У айчынным літаратуразнаўстве неаднаразова адзначалася, што пісьменнік імкнецца паказаць галоўнага героя звычайным чалавекам са сваімі недахопамі, аднак яго станоўчыя якасці відавочна пераважаюць. В.І. Локун трапна зазначае, што Карнач «найперш мастак, эстэт, які дбае аб архітэктурнай гармоніі» [7; с. 612]. Пісьменнік падкрэслівае імкненне героя тварыць не толькі на карысць грамадства, але і сваёй сям'і. Ён імкнецца падарыць жонцы і дачцэ тое, што можна вобразна назваць казачным харамком, калі будуе дачу, паказвае сябе не толькі як архітэктар, але і дызайнер,

разбяр. Як сапраўдны творца, Максім Карнач марыць выразаць скульптуру, якая будзе адметнай. І невыпадковым бачыцца тое, што герой суадносіць сваю задуму з вобразам маці, адчувае значнасць традыцый народнага мастацтва. У творы паслядоўна даказваецца, што сапраўдны талент праяўляе сябе, калі яго носьбіт надзелены вартымі чалавечымі якасцямі. Як і ў лірычнай прозе, асоба галоўнага героя арганізуе вакол сябе вобразную сістэму твора, што выяўляе «цэнтраімклівасць» рамана «Атланты і карыятыды». Побач з Максімам Карначом увасоблены розныя тыпы творцаў. Зайздросціць таленту і пасадзе галоўнага архітэктара Макаед, які выступае маральна-этычным антыподам героя. Макаеду выносіцца маральны прысуд, які не падлягае сумненню: «Усё жыццё рабіў іншым гадасці і патрабуе за гэта ўсеагульнай любві» [8; с. 306]. Іх прафесійныя ўзаемаадносіны асацыятыўна супастаўляюцца з вядомай гісторыяй пра Моцарта і Сальеры, якую палемічна абмяркоўваюць героі. Шэраг вобразаў у рамане адцяняе ў тым ліку і творчую атмасферу, скіроўвае да больш глыбокага асэнсавання чалавечых узаемаадносін: прымае светапогляд свайго мужа, па-чалавечы яго падтрымлівае Поля Шугачова, для якой сэнс жыцця заключаецца ў клопаце пра дзяцей і людзей наогул, Даша Карнач, наадварот, стварае для свайго блізкага чалавека невыносныя ўмовы ў побыце, што адбіваецца і на яго творчасці [9].

**Заключэнне.** Беларускімі раманістамі з 1960-х гадоў усебакова даследуецца ўнутраны свет творчай асобы ў яе стасунках з рэчаіснасцю, раскрываецца ўплыў сацыяльных працэсаў на прыватнае жыццѐ і самапачуванне асобы. Раманны канфлікт са знешняй сферы пераносіцца ва ўнутраную, духоўна-псіхалагічную, духоўны свет асобы выступае прадметам паглыбленага разгляду ў маральна-этычным, нацыянальным, філасофскім складніках. Творчай задачай прасачыць духоўнае жыццё героя абумоўлена складаная арганізацыя рамана «Нельга забыць»: У. Караткевіч адмаўляецца ад раскрыцця падзей у лагічнай паслядоўнасці, выкарыстоўвае навелістычны прынцып будовы, звяртаецца да ўвасаблення двух сюжэтаў. Наватарства беларускага аўтара заключаецца ў тым, што Андрэй Грынкевіч паводле маральна-этычных памкненняў асацыятыўна супастаўляецца з Юрыем Горавым. Аўтарская пазіцыя ў беларускім рамане 1966–1985-х гадоў выяўляецца праз пастаноўку ў цэнтр сістэмы персанажаў героя як выразніка маральна-этычных поглядаў пісьменніка. Галоўнаму герою перададзена значная мера аўтарскага духоўнага вопыту ў раманах лірычных («Нельга забыць» У. Караткевіча, «Птушкі і гнёзды» Я. Брыля). Максім Карнач, які выступае ў рамане І. Шамякіна эталонам чалавечых якасцяў, паказаны пісьменнікам сапраўдным творцам, прыкметна ўзвышаецца над сваім сацыяльным асяроддзем. На філасофскім узроўні паслядоўна сцвярджаецца думка, што чалавечыя заганы ў значнай меры абумоўліваюць і мастакоўскае аблічча.


1. Верабей, А.Л. Уладзімір Караткевіч : жыццё і творчасць / А.Л. Верабей. – Мінск : Беларус. навука, 2005. – 271 с.

2. Гальго, Н.В. Тэксталогія рамана «Атланты і карыятыды» / Н.В. Гальго // Тэксталогія твораў І. Шамякіна : па выніках выдання Збору твораў у 23 тамах / А.А. Васілевіч [і інш.] ; навук. рэд. М.А. Тычына. – Мінск, 2016. – С. 245–260.

3. Каваленка, В.А. Покліч жыцця : літаратурная крытыка / В. А. Каваленка. – Мінск : Маст. літ., 1987. – 230 с.

4. Дзюбайла, П.К. Рупары ідэй ці мастацкія вобразы? / П. К. Дзюбайла // У вялікай дарозе : літаратурна-крытычныя артыкулы. – Мінск, 1981. – С. 31–37.

5. Караткевіч, У. Збор твораў : у 8 т. / У. Караткевіч. – Мінск : Маст. літ., 1987–1991. – Т. 3: Раман. Аповесці. – 1988. – 543 с.

6. Караткоў, М. «Кожны чалавек – загадка, і разгадаць яе адразу нялёгка» / М. Караткоў // Збор твораў : у 23 т. / І. Шамякін; падрыхт. тэкстаў і камент. Н. Гальго ; паслясл. М. Караткова ; Нац. акад. навук Беларусі, Цэнтр даслед. беларус. культуры, мовы і літ. – Мінск, 2013. – Т. 15: Атланты і карыятыды : раман / І. Шамякін. – С. 424–461.

7. Локун, В.І. Іван Шамякін / В.І. Локун // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. / НАН Беларусі, Ін-т літаратуры імя Я. Купалы ; навук. рэд. У.В. Гніламёдаў, В.П. Жураўлёў. – Мінск, 2001. – Т. 3. – С. 597–639.

8. Шамякін, І. Збор твораў : у 23 т. / І. Шамякін ; Нац. акад. навук Беларусі, Цэнтр даследаванняў бел. культуры, мовы і літ. – Мінск : Маст. літ., 2013. – Т. 15: Атланты і карыятыды : раман / І. Шамякін ; падрыхт. тэкстаў і камент. Н. Гальго ; паслясл. М. Караткова. – 495 с.

9. Навасельцава, Г.В. Жанр рамана ў беларускай літаратуры другой паловы XX – пачатку XXI стагоддзя : манаграфія / Г.В. Навасельцава ; М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, Віцеб. дзярж. ун-т. – Віцебск : ВДУ, 2020. – 268 с. – Рэжым доступу: https://rep.vsu.by/handle/123456789/25755 (дата звароту: 29.01.2024).